ВЕСЦІ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСКАЙ ССР № 2 1982
СЕРЫЯ ГРАМАДСКІХ НАВУК

## *ХРОНІКА*

# ПАМЯЦІ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

90-годдзе з дня нараджэння выдатнага беларускага паэта Максіма Багдановіча шырока адзначалася ў Беларусі і за межамі рэспублікі. У юбілейных урачыстасцях прымалі ўдзел і вучоныя Акадэміі навук БССР. 27 лістапада 1981 г. адбылася навуковая сесія, прысвечаная 90-гадоваму юбілею Максіма Багдановіча. Сесія была падрыхтавана Аддзяленнем грамадскіх навук АН БССР, Саюзам пісьменнікаў БССР і ордэна Дружбы народаў Інстытутам літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР.

Уступным словам сесію адкрыў першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Н. С. Гілевіч. «Ужо не два, а тры прозвішчы славутых беларускіх паэтаў — Коласа, Купалы і Багдановіча — ставім мы сёння побач як нашых класікаў, з якіх пачыналася развіццё новай беларускай літаратуры,— сказаў ён.— Рыхтуючыся да юбілею, мы па-новаму ўбачылі Максіма Багдановіча, значэнне яго творчай спадчыны, і мы павінны яшчэ многае зрабіць, каб належным чынам ацаніць тое, што прыйшло з ім у нашу літаратуру».

З дакладам «Максім Багдановіч і Янка Купала» выступіў доктар філалагічных навук, прафесар А. А. Лойка. Ён падрабязна разгледзеў творчасць Багдановіча ў святле яе ўзаемаадносін з паэзіяй таго часу, паказаў, як імкліва развіваўся Максім Багдановіч як паэт, крытык, даследчык, нагадаў рад цікавых фактаў творчага ўзаемадзеяння выдатных майстроў паэтычнага слова. У дакладзе «Максім Багдановіч як наватар беларускага верша», з якім выступіў доктар філалагічных навук, прафесар М. М. Грынчык, разгледжаны асаблівасці паэтычнай спадчыны М. Багдановіча. М. М. Грынчык на аснове аналізу верша М. Багдановіча і суаднясення мастацкай манеры паэта з творчай практыкай майстроў слова таго часу паказаў наватарства М. Багдановіча ў авалоданні новымі формамі і прыёмамі, гаварыў аб тым уплыве, які мелі на яго літаратуры заходнееўрапейскіх краін, руская класічная літаратура. Даклад доктара філалагічных навук М. І. Мушынскага «Максім Багдановіч — крытык і гісторык літаратуры» быў прысвечаны праблемам метадалогіі літаратурнакрытычнага і гісторыка-літаратурнага даследавання творчасці паэта ў апошнія гады, вывучэння яго крытычнай спадчыны, яе значэння для сучаснага літаратуразнаўства. Дакладчык гаварыў, што перш за ўсё трэба заняцца вывучэннем літаратуразнаўчай метадалогіі М. Багдановіча. Гэта цэлы комплекс пытанняў, паспяховае вырашэнне якіх дасць магчымасць раскрыць творчасць М. Багдановіча як выдатную з'яву ў гісторыі беларускай літаратуры, літаратуразнаўства, наогул нацыянальнай культуры.

«Ідэйна-мастацкія традыцыі Максіма Багдановіча» — тэма даклада кандыдата філалагічных навук А. К. Кабаковіч. Даследчыца творчасці паэта, аўтар кнігі «Паэтыка Максіма Багдановіча», паказала яго спадчыну ў святле традыцый і наватарства. З паведамленнем «Максім Багдановіч у зарубежным друку» выступіў навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры Л. А. Казыра. Ён асвятліў некаторыя моманты ў ацэнцы творчасці М. Багдановіча зарубежнай крытыкай і літаратуразнаўствам, больш падрабязна спыніўшыся на аналізе публікацый у англійскай славістычнай перыёдыцы, у прыватнасці на артыкулах А. Макміліна і В. Рыч.

Галоўны бібліёграф Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна Н. Б. Ватацы расказала пра пошукі матэрыялаў аб жыцці і творчасці Максіма Багдановіча, якімі яна займаецца ўжо многа год, паведаміла пра свае новыя знаходкі.

З паведамленнем «М. Багдановіч у Мінску» выступіў навуковы рэдактар Беларускай Савецкай Энцыклапедыі імя П. Броўкі В. У. Скалабан. Ён пазнаёміў прысутных са знойдзенымі ім у архівах новымі дакументамі, звязанымі з жыццём Максіма Багдановіча ў Мінску.

У рабоце навуковай сесіі прыняў удзел прэзідэнт Акадэміі навук БССР акадэмік М. А. Барысевіч.

*М. П. КЕНЬКА*

# ПРЫСВЯЧАЕЦЦА АКАДЭМІКУ У. І. ПІЧЭЦЕ

Жыццё і творчасць гэтага чалавека назаўсёды ўвайшлі ў гісторыю савецкай навукі і культуры. Выдатны савецкі вучоны, адзін з заснавальнікаў беларускай савецкай гістарычнай навукі, акадэмік, заслужаны прафесар БССР, заслужаны дзеяч навукі Узбекскай ССР Уладзімір Іванавіч Пічэта (1878—1947) быў першым рэкта-

рам Беларускага дзяржаўнага універсітэта, правадзейным членам Інстытута беларускай культуры, адным з ініцыятараў стварэння Акадэміі навук БССР і Інстытута славяназнаўства АН СССР, заснавальнікам і першым кіраўніком кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта. Пяру У. І. Пічэты належыць 515 прац па гісторыі Расіі, Украіны, Беларусі, Літвы, Узбекістана, Польшчы, Чэхіі, Югаславіі, Балгарыі. Каля 150 яго работ прысвечаны сацыяльна-эканамічнай, палітычнай і культурнай гісторыі Беларусі эпохі феадалізму і капіталізму, а таксама беларускай гістарыяграфіі, крыніцазнаўству, краязнаўству.

Іменна гэтым можна растлумачыць вялікую цікавасць, якую праявіла навуковая грамадскасць да ўсесаюзных чытанняў, прысвечаных акадэміку У. І. Пічэце, якія праходзілі 22 кастрычніка 1981 г. у Інстытуце славяназнаўства і балканістыкі АН СССР. Чытанні ўступным словам адкрыў доктар гістарычных навук У. А. Дзякаў. Ён даў высокую ацэнку навуковым даследаванням акадэміка У. І. Пічэты ў галіне славяназнаўства. Выключная эрудыцыя, шматгранная навуковая дзейнасць і вялікі педагагічны талент уключылі яго ў лік самых відных прадстаўнікоў савецкай гістарыяграфіі. З вялікай увагай былі праслуханы даклады У. А. Дзякава «Аб'ектыўныя прадпасылкі развіцця савецкай славістыкі ў 30—70-х гадах» і І. І. Удальцова і Л. В. Забароўскага «Канцэпцыя У. І. Пічэты па пытанню разлажэння феадалізму і прадпасылак рэвалюцыі ў землях Аўстрыйскай манархіі» і «Знешнепалітычныя адносіны Расіі і Рэчы Паспалітай у XVII стагоддзі ў савецкай гістарыяграфіі 30—70-х гадоў». У дакладзе У. А. Дзякава, у прыватнасці, адзначалася, што з 1939 г. вывучэнне славянскай гісторыі ўзнялося на новую ступень. У Інстытуце гісторыі АН СССР быў створаны сектар славяназнаўства, а ў Маскоўскім універсітэце адкрыта кафедра гісторыі паўднёвых і заходніх славян. Сектар і кафедру ўзначаліў У. І. Пічэта, які намеціў шырокую праграму вывучэння гісторыі зарубежных славян і падрыхтоўкі кадраў гісторыкаў-славістаў.

«Распрацоўка праблем феадалізму ў навуковым (аспіранцкім) семінары У. І. Пічэты» — такой была тэма выступлення былога аспіранта акадэміка Пічэты, а цяпер старшага навуковага супрацоўніка сектара гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў Інстытута славяназнаўства і балканістыкі АН СССР Г. Э. Санчука. Ён падкрэсліў, што навуковыя поспехі кафедры паўднёвых і заходніх славян МДУ ў значнай ступені былі абумоўлены сувязямі з сектарам славяназнаўства Інстытута гісторыі АН СССР, а потым — з Інстытутам славяназнаўства АН СССР. Адной з праяў гэтай сумеснай працы быў семінар аспірантаў-славістаў пад кіраўніцтвам акадэміка У. І. Пічэты, якому сам Уладзімір Іванавіч аддаваў шмат сіл і часу. Актыўны ўдзел у рабоце семінара прымалі У. Д. Каралюк, І. М. Бяляўская, І. І. Удальцоў, І. С. Дасцян, Н. Д. Ратнер, М. А. Бірман, К. І. Казырына, Ф. А. Грэкул і інш. З іменамі гэтых відных савецкіх вучоных-славістаў звязана распрацоўка многіх складаных праблем феадалізму пры вывучэнні гісторыі Польшчы, Чэхаславакіі, Югаславіі, Балгарыі.

Рад дакладаў быў прысвечаны жыццю і дзейнасці У. І. Пічэты ў Беларусі, яго ролі ў развіцці беларускай савецкай навукі і культуры. З імем У. І. Пічэты, адзначыў у сваім дакладзе Э. Р. Іофе, звязаны пачатковы перыяд беларускай савецкай гістарычнай навукі як самастойнай навуковай з'явы, яе станаўленне і развіццё ў 20—30-х гадах. На аснове аналізу творчай спадчыны вучонага было паказана, што працы У. І. Пічэты «Аграрная рэформа Сігізмунда-Аўгуста ў Літоўска-Рускай дзяржаве», «Уводзіны ў рускую гісторыю (крыніцы і гістарыяграфія)», «Склад насельніцтва ў гаспадарскіх дварах і валасцях заходняй часткі Беларусі ў парэформенную эпоху», «Эпоха гарадской гаспадаркі ў Беларусі», «Гісторыя сельскай гаспадаркі і землеўладання ў Беларусі», ч. 1, «Гістарычны лёс Заходняй Беларусі», «Юрыдычнае становішча сельскага насельніцтва на прыватнаўладальніцкіх землях да часу выдання Літоўскага Статута 1529 г.» і іншыя адыгралі вялікую і важную ролю ў станаўленні беларускай савецкай гістарыяграфіі. Гэтыя даследаванні змяшчаюць упершыню выразна абмаляваную структуру феадальнага ладу, якая склалася ў Беларусі ў XV—XVI стст. Аналізуючы розныя бакі аграрнага ладу і высвятляючы прававое і эканамічнае становішча сялянства, У. І. Пічэта раскрыў працэс запрыгоньвання сялянства Беларусі. Быў разгледжаны і ўплыў прац Пічэты на даследаванні яго вучняў і саратнікаў — А. В. Бурдзейкі, Т. І. Забелы, К. І. Кернажыцкага, Т. М. Сцяпанава, В. Д. Дружчыца, Д. І. Даўгялы, М. В. Мялешкі, Д. А. Жарынава і іншых па розных пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў эпоху феадалізму.

Л. І. Уткіна прывяла новыя цікавыя факты аб шматграннай навуковай, арганізатарскай, грамадскай, педагагічнай дзейнасці У. І. Пічэты на пасадзе рэктара Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Яна прывяла аргументаваныя доказы таго, што акрамя вялікай навуковай працы вучонага па гісторыі Беларусі ў 20-я гады ён даследаваў розныя пытанні славяназнаўства, чытаў спецыяльныя курсы для студэнтаў аб гісторыі славянскіх краін.

А. І. Рогаў у сваім выступленні адзначыў, што, нягледзячы на некаторыя недахопы, творы У. І. Пічэты па гісторыі беларускай культуры маюць вялікую навуковую каштоўнасць. Вучоны ў цэлым вызначыў лінію для больш позніх даследаванняў па праблемах культурнага развіцця Беларусі ў эпоху феадалізму.

Удзельнікі чытанняў з вялікай цікавасцю слухалі ўспаміны былога студэнта БДУ 20-х гадоў, старшага навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі АН СССР, доктара гістарычных навук М. М. Улашчыка, які расказаў аб дзейнасці У. І. Пічэты ў 20-я гады ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, і доктара гістарычных навук Н. Н. Кушавай аб рабоце У. І. Пічэты ў

Інстытуце гісторыі АН СССР у 1943—1947 гг.

У заключным слове загадчык кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян МДУ імя М. В. Ламаносава прафесар В. Г. Карасёў паведаміў, што чытанні 1984 г., прысвечаныя акадэміку У. І. Пічэце, адбудуцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна.

*Э. Р. ІОФЕ*

## СУЧАСНЫЯ ПРАБЛЕМЫ АНТРАПАЛОГІІ

Другая Усесаюзная антрапалагічная канферэнцыя, якая адбылася ў Мінску ў верасні 1981 г., была арганізавана секцыяй антрапалогіі Усесаюзнага навуковага таварыства анатамаў, гістолагаў і эмбрыёлагаў. Яе арганізатарамі з'явіліся таксама Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР і кафедры анатоміі інстытутаў фізкультуры Масквы і Мінска. Цеснае супрацоўніцтва медыкаў (анатамаў, гістолагаў, эмбрыёлагаў) і антраполагаў — з'ява не новая. Яшчэ ў дарэвалюцыйны час і ў першы перыяд развіцця савецкай антрапалогіі арганізатарамі і кіраўнікамі навуковых таварыстваў, у рамках якіх праводзіліся антрапалагічныя даследаванні, побач з прадстаўнікамі грамадскіх навук Д. Н. Анучыным, А. П. Багданавым стаялі вядомыя дзеячы медыцынскай навукі А. І. Таранецкі, С. І. Рудэнка, І. П. Паўлаў, В. Н. Танкоў і інш. У 1930 г. у Кіеве адбыўся IV з'езд заолагаў, анатамаў і гістолагаў, дзе антрапалогія была прадстаўлена асобнай секцыяй. У час яе работы былі перагледжаны задачы антрапалогіі, яе тэарэтыка-метадалагічныя асновы, намецілася выдзяленне трох узаемазвязаных раздзелаў антрапалагічнай навукі — марфалогіі, антрапагенезу і расазнаўства.

У пасляваенны перыяд у СССР асабліва інтэнсіўна развіваецца этнічная антрапалогія — праводзяцца даследаванні і публікуюцца працы, прысвечаныя праблемам этнічнай гісторыі народаў Савецкага Саюза. На першы погляд гэты раздзел здаецца менш звязаным з медыцынскімі дысцыплінамі, чым іншыя. Але практыка паказала, што паспяховае развіццё этнічнай антрапалогіі можа быць дасягнута за кошт комплексных падыходаў. Выкарыстанне антраполагамі метадаў і дасягненняў медыкабіялагічных навук прывяло да выдзялення асобага раздзела — фізіялагічнай антрапалогіі, дзякуючы якой характарыстыка рас стала больш поўнай, паколькі яна праводзіцца не толькі па марфалагічных, але і па фізіялагічных прыкметах.

У апошнія гады ў задачу даследаванняў сектара этнічнай антрапалогіі Інстытута этнаграфіі АН СССР імя Н. Н. Міклухі-Маклая ўваходзіць не толькі рашэнне праблем этнагенезу і этнічнай гісторыі народаў нашай краіны, але і даследаванне этнічных і клімата-геаграфічных аспектаў даўгалецця. Узаемасувязь антрапалогіі і медыцыны і комплексны падыход да праблемы даюць больш важкія аргументы для вырашэння і біялагічных, і гістарычных праблем.

Новыя этапы ў галіне супрацоўніцтва антраполагаў і медыкаў адкрыліся пасля першай Усесаюзнай антрапалагічнай канферэнцыі, праведзенай у чэрвені 1979 г. у Вінніцы. Разглядаючы антрапалогію як сістэму навук у іх узаемаабумоўленасці і ўзаемасувязі, гэта ўстаноўчая канферэнцыя ў ліку першачарговых задач намеціла развіццё антрапалагічнай генетыкі, уключаючы генетыку развіцця, вывучэнне экалогіі чалавека, распрацоўку фізіялагічнай, біяхімічнай і псіхалагічнай антрапалогіі, актывізацыю даследаванняў у галіне антрапагенезу і этнічнай антрапалогіі.

На II Усесаюзнай антрапалагічнай канферэнцыі ў Мінску абмяркоўваліся першыя вынікі выканання гэтых задач. Канферэнцыя сабрала вялікую групу спецыялістаў антрапалагічнага профілю — 140 дэлегатаў з 50 гарадоў краіны. У іх ліку лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР акадэмік АМН СССР В. В. Купрыянаў, доктар медыцынскіх навук, прафесар Б. А. Нікіцюк, іншыя вядучыя антраполагі Масквы — Е. Н. Хрысанфава, М. І. Урысон, Н. Н. Міклашэўская, Г. Л. Хіць, О. М. Паўлоўскі, Н. Н. Дубава, Н. А. Нікольская, А. А. Гладышава, Беларусі — члены-карэспандэнты АН БССР Н. І. Арынчын, В. К. Бандарчык, С. В. Марцэлеў, іншых гарадоў краіны — Ф. В. Судзілоўскі (Ленінград), М. А. Джафараў (Львоў), Р. Н. Дорахаў (Смаленск), В. Я. Камышаў (Валгаград) і інш. На канферэнцыі працавалі секцыі этнічнай, анатамічнай, фізіялагічнай, біяхімічнай, псіхалагічнай, узроставай, спартыўнай антрапалогіі, эксперыментальных мадэлей у спартыўнай марфалогіі, секцыі метадаў антрапалагічных даследаванняў і праблемы біясацыяльнага ў сучаснай антрапалогіі.

На пасяджэннях секцый было абмеркавана каля 130 дакладаў. З праблемных дакладаў, заслуханых на пленарных пасяджэннях, глыбокую цікавасць выклікалі наступныя: «Шляхі развіцця сучаснай антрапалогіі» (Б. А. Нікіцюк, Масква), «Спецыфіка антрапалогіі як адзінай і цэласнай навукі» (М. І. Урысон, Масква) і «Рэканструктыўная антрапалогія — фантастыка ці рэальнасць?» (А. І. Сыкала, Мінск). Дыскусія за круглым сталом вялася па тэме «Галаўны мозг чалавека як вышэйшая ступень эвалюцыі жывой матэрыі — сацыяльная матэрыя», узнятай В. В. Купрыянавым і Б. А. Нікіцюком.

На секцыйных пасяджэннях, прысвечаных праблемам этнічнай антрапалогіі, абмяркоўваліся новыя даныя па этнагенезу розных народаў нашай краіны. Этнагенезу эстонцаў прысвяцілі свае даклады Л. Хеапост і І. І. Сарап (Талін). Г. Чэсніс з Вільнюса даў антрапалагічную характарыстыку насельніцтва Літвы II—V стст. н. э. Доктар гістарычных навук Р. Я. Дзянісава (Рыга) прывяла ў сваім дакладзе новыя